*Да 85-годдзя ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі*

Ванда БАРОЎКА,
доктар філалагічных навук

# УЗ'ЯДНАННЕ БЕЛАРУСІ Ў МАСТАЦКІМ АДЛЮСТРАВАННІ ПРАЗАІКАЎ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX – ПАЧАТКУ XXI ст.

Важнай датай у гісторыі Беларусі стала 17 верасня 1939 г. Першымі на вызваленчы паход Чырвонай арміі адгукнуліся паэты. Радасна віталі ў вершах падзею Пятрусь Броўка ("Заходнім беларусам", "Кліч народа"), Пятро Глебка ("Родным братам"), Анатоль Астрэйка ("Сустрэча", "Дружба"), Янка Купала ("Ты з Заходняй, я з Усходняй"), чыйго лірычнага героя натхняла магчымасць у адной вялікай сям'і разам працаваць і складаць "*думкі-песні*". Яркім эмацыйным водгукам з боку заходніх беларусаў стаў верш "Здарова, таварышы!" Максіма Танка з акцэнтаваннем доўгачаканасці прыходу Чырвонай арміі, веры ў светлую будучыню роднай зямлі. У 1940 г. з'явілася паэма "Беластоцкія вітрыны" Пімена Панчанкі, непасрэднага ўдзельніка вызваленчага паходу Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь. Лірычны герой паэмы з гонарам пазіцыянуе сябе выратавальнікам Беластока, дзе "*нэндза вузкія вулкі палоніла нератам / І галёкала нема над горадам гора*" [1, с. 110]. Яго радуюць пераможны крок імклівага ваеннага паходу Чырвонай арміі, уцёкі паноў і засмучае тое, што яму асабіста "*нават ніводную панскую пятку / Падстрэліць не давялося*" [1, с. 111]. Для байца Чырвонай арміі Беласток – горад, дзе суседнічалі беднасць і багацце, дзе бедната чакала дапамогі з Усходняй Беларусі. Калі прыйшла дапамога, ткачы прынялі рашэнне: "*Рынак ушчэнт растаўчы, / Крамы гандлярскія з гораду вымесці, / Плошчу ўсю сонечным каменем вымасціць*" [1, с. 116]. Уз'яднанне ў "Беластоцкіх вітрынах" – запарука росквіту Беларусі.

Шлях да ўз'яднання, а не само ўз'яднанне знаходзіліся ў цэнтры ўвагі ў рамане "Сустрэнемся на барыкадах" (1954) Піліпа Пестрака, аповесцях "Перад вераснем" (1957) Алеся Бажко, "Па хісткай лесвіцы" (надрукавана ў 1988 г.) Лідзіі Ялоўчык. У параўнанні з першымі літаратурнымі водгукамі на ўз'яднанне і напісаным П. Пестраком, А. Бажко, Л. Ялоўчык грунтоўным асэнсаваннем падзей 1939 г. ды перадваеннай заходнебеларускай рэчаіснасці вызначаюцца творы пісьменнікаў, якія нарадзіліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі і ў дзяцінстве сталі відавочцамі 17 верасня 1939 г.

У 1978 г. надрукаваны раман **"Падвышанае неба"** ***Віктара Каваленкі*** – своеасаблівая мастацкая хроніка падзей ад уваходу Чырвонай арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі да Вялікай Айчыннай вайны. Яны паказваюцца вачамі падлетка Арсеня і маладога чалавека, былога ўдзельніка падпольнай барацьбы і былога члена КПЗБ Марціна Ракавецкага. Раман пачынаецца апісаннем уцёкаў палякаў напярэдадні прыходу Чырвонай арміі, за якімі з цікавасцю і затоеным задавальненнем назіралі вяскоўцы-беларусы, што рады былі пазбавіцца ад чужой апекі. У творы праз мастацкія дэталі адзначаецца беднасць беларускіх сялян у параўнанні з палякамі. Напрыклад, вяскоўцы гатовы былі падбіраць з зямлі белыя грудкі цукру, што высыпаліся з мяшка гаспадароў адной з польскіх фурманак, бо цукар каштаваў дорага. Гледзячы на ўцёкі палякаў, вяскоўцы адчулі няпэўнасць, пераходнасць часу, "*калі трасецца-калоціцца свет*" [2, с. 11], неабходнасць мець трывалую апору, быць абачлівымі. Спачатку людзі разгубіліся, нават былыя члены КПЗБ не ведалі, што трэба рабіць у сітуацыі, калі адна ўлада скончылася, а другая яшчэ не прыйшла.

Падрабязна паказваецца ў творы першая сустрэча вяскоўцаў з савецкімі танкістамі; падкрэсліваецца, што чырвонаармейцы паводзілі сябе дружалюбна, паважліва ў дачыненні да мясцовага насельніцтва, адмаўляліся ад прапанаваных пачастункаў, чаго ніколі не рабілі польскія вайскоўцы. Камандзір, калі даведаўся пра параненага Пронькам Пракопчыкам польскага жаўнера, перасцярог пра небяспечнасць самасуду: "*Свабода – гэта не самасуд. Свабода – гэта перш за ўсё адказнасць і дысцыпліна*" [2, с. 32]. Прыходу Чырвонай арміі, уз'яднання, у трактоўцы пісьменніка, чакалі многія заходнія беларусы, найперш камуністы і моладзь, але былі і такія, што, наслухаўшыся перадач польскага радыё, пабойваліся бальшавікоў. Для Марціна з'яўленне савецкіх

танкістаў стала святам, ажыццяўленнем мары. Арсеню спадабаліся таварыскасць вайскоўцаў і падарунак камандзіра танкістаў – чырвоны аловак і тоўсты сшытак, бо хлопец хацеў вучыцца.

Вясковае асяроддзе ў рамане паўстае кансерватыўным. З'яўленне Чырвонай арміі спачатку ўзрадавала сялян, а потым занепакоіла: яны баяліся, што вёска стане прыфрантавой, пачнуцца баі, запануюць небяспека і разбурэнне. Калі калона танкаў рушыла далей, то частка вяскоўцаў, карыстаючыся безуладдзем, кінулася рабаваць панскі маёнтак. Не ўстрымаўся і Арсень, але разам з сябрам прынёс адтуль не рэчы, а кнігі і часопісы. У Марціна ўчынак землякоў выклікаў прыкрасць і незадавальненне.

"Падвышанае неба" – цікавая гістарыяграфічная крыніца, бо ў ёй расказваецца пра перамены, звязаныя з прыходам Чырвонай арміі: стварэнне на вёсках камітэтаў беднаты і часовых рэвалюцыйных камітэтаў, падзел панскай зямлі паміж беднякамі, саветызацыя, вяртанне былых зняволеных з польскіх турмаў, а салдат з польскага войска. Ва ўзаемадачыненнях паміж людзьмі, народжаных новымі сацыяльнымі абставінамі, нярэдка спалучалася сур'ёзнае і кур'ёзнае. Для прыкладу, некаторых хвалявала пытанне, ці варта аддаваць пазычаныя пры польскай уладзе ў багацейшых суседзяў грошы, з улікам таго, што грошы памяняюцца і што савецкая ўлада абараняе інтарэсы бедных. Свабоду частка сялян зразумела як усёдазволенасць. Адзін з вяскоўцаў з горыччу заўважыў: "*Дачакаліся волі, уздыхнулі лёгка. Але зноў непарадкі, бо аказалася, што не ўмеем жыць, маючы волю. Другому нашаму чалавеку дай поўную волю, то ён нос суседу адкусіць – і будзе рад. Слабода ж!..*" [2, с. 97].

Пэўнае месца адводзілася ў творы адлюстраванню змен у выхаванні і навучанні дзяцей. Перад мясцовымі ўладамі паўстала пытанне пра матэрыяльнае забеспячэнне настаўнікаў. Гультай Барнась на агульным сходзе запатрабаваў адмяніць плату настаўнікам, бо пры польскай уладзе яны былі панамі. Людзі з ім не пагадзіліся, таму што хацелі бачыць сваіх дзяцей адукаванымі. Пры павазе да большасці настаўнікаў вяскоўцы не любілі педагога Дубіцкага, які выказваўся крытычна пра беларусаў: "*О, беларусы дужа любяць спакой і цёплую печ. За гэта бацьку роднага прададуць і ўсю Беларусь аддадуць у прыдачу...*" [2, с. 120]. Настаўніцтва ў рамане – асяроддзе, што ўлічвае дух часу, прыстасоўваецца да яго. Тыя, хто працаваў у школе пры палякках, сталі выкладаць на беларускай мове, а некаторыя, як паслядоўніца педагагічных ідэй Канстанціна Міцкевіча Марына Віктараўна, вучылі не польскай, а беларускай мове і сродкамі мастацкай літаратуры развівалі мысленне вучняў.

Цэнтральны герой рамана – Марцін Ракавецкі. Ён поўны планаў разам з землякамі "*змяніць старое абрыдлае жыццё*" [2, с. 65]. Ракавецкі добра ведаў жыццё аднавяскоўцаў, бачыў сярод бедных людзей вартых спачування, якім не шанцавала ў жыцці, а таксама гультаёў кшталту Барнася і аматараў "*паказаць шык*" [2, с. 78], як Ігнась з Сабінай. Марцін меркаваў, што пры новых сацыяльных умовах можна будзе пазбавіцца ад беднасці, якая маральна нявечыць чалавека. Ён марыў змяніць векавую псіхалогію землякоў, для каго памагчы суседу – "*тое самае, што зрабіць сабе шкоду*" [2, с. 154], а падмануць дзеля асабістай выгады – этычная норма. Ракавецкі разумеў, што падманваць, красці, хітраваць людзей прывучалі абставіны, выхадам з беднасці яму бачылася стварэнне калектыўнай гаспадаркі. Арганізацыя калгаса, які ўзначаліў Марцін, у творы паказана аблегчана: вяскоўцы амаль адразу падтрымалі земляка, даверылі яму свае гаспадаркі і свае лёсы.

Марцін ненавідзеў патрыярхальную заскарузласць, бескультур'е, працаваў дзеля змянення жыцця да лепшага, захапляўся адукаванымі і разумнымі людзьмі. Яго маральны антыпод – Пронька Пракопчык. Пронька таксама быў членам КПЗБ, ён заўсёды і ва ўсім кіраваўся выключна прыватнымі інтарэсамі. Напрыклад, параніў польскага жаўнера за тое, што той хацеў скрасці кабылу брата для ўцёкаў ад чырвонаармейцаў; калі стаў участковым міліцыянерам, то патрабаваў ад самагоншчыкаў плату за самагонаварэнне; калі не змог адразу стаць старшынёй калгаса, то напісаў ілжывы данос на Марціна, нібы той справіў вяселле за калгасны кошт. Пронька абзываў мясцовых кіраўнікоў "*капунамі*", што "*ўтапіліся*" ў малых справах замест таго, каб займацца класавай барацьбой, а класавую барацьбу разумеў як расправу з тымі, хто яму не дагадзіў. Калі Марцін імкнуўся служыць справе і людзям, то Пронька – задавальняць уласныя інтарэсы шляхам дэмагогіі і грубай сілы.

Пачатак Другой сусветнай вайны, пераслед і арышты польскімі ўладамі былых членаў КПЗБ і падазроных людзей, самы пярэдадзень уз'яднання – сацыяльны фон у рамане **"Год нулявы"** (1981) ***Вячаслава Адамчыка***. У творы расказваецца пра ўстрывожанасць заходніх беларусаў нападам Германіі на Польшчу, пра абумоўленыя ваеннай сітуацыяй змены ў грамадскім жыцці, пра панічнае адступленне палякаў і выкліканае гэтым кароткачасовае безуладдзе. Асноўнае месца дзеяння – вёска Верасава і мястэчка Дварчаны, большасць жыхароў якіх сталі не столькі ўдзельнікамі гістарычных падзей, колькі іх сведкамі. Вясковец Жэнік Рэпка, былы член КПЗБ Саўка Аўсянік і былы парабак Імполь, спадзею-

чыся на прыход Чырвонай арміі, узялі на сябе ролю прадстаўнікоў новай улады, але ў іх поглядах не было адзінства. Імполь і Аўсянік не ўхвалялі жорсткасць Жэніка. Ён дэманстрацыйна хадзіў з чырвоным бантам на грудзях, разам з Імполем і Аўсянікам лавіў паліцыянтаў і польскіх салдат перад асадніцкай сядзібай. Красамоўна падкрэсліваюць сутнасць яго характару паводзіны перад вясковым крыжам: Жэнік разбіў невысокі плот, стаптаў пасаджаныя вяргіні, хацеў, але не змог выцягнуць крыж – абаронцу вёскі. Аўсянік баяўся, каб паводзіны Жэніка не "*ўзбунтавалі*" верасаўцаў. Падчас безуладдзя вяскоўцы пачалі рабаваць асаду Грабянкі, а Жэнік забіў шабляй яе гаспадара. У рамане паказаны драматычны перыяд, калі ў паводзінах часткі людзей узяў верх разбуральны пачатак.

Час станаўлення савецкай улады адлюстраваны ў рамане **"І скажа той, хто народзіцца"** (1987) ***Вячаслава Адамчыка***, што пачынаецца з апісання прыходу ў Верасава Чырвонай арміі: "*Падымаючы пыл і страшны жалезны грукат і ўпарта памахваючы настаўленымі дуламі гармат, абдепленыя пяхотай ішлі танкі, потым ужо, збіваючыся з чацвёрак, паплыла кавалерыя і, абганяючы яе, пятлялі чорнымі жукамі шпаркія легкавушкі з пукатымі гарачымі вачмі блішчастых фараў, чмыхалі сінім дымам з тонкіх камінкоў марудныя, да глухаты ў вушах ракатлівыя трактары з цяжкімі прычэпленымі гарматамі...*" [3, с. 3]. Асабліва ўразілі вяскоўцаў "*бураватыя двухгорбыя вярблюды*" [3, с. 3] у вайсковым абозе. Верасаўцы імкнуліся даведацца ад чырвонаармейцаў пра жыццё ў Савецкім Саюзе, а старых людзей цікавілі адносіны бальшавікоў да Бога. Адзін з іх спытаў пра гэта ў савецкага афіцэра і пачуў у адказ: "*Дедушка, ни мы к Богу не имеем никакого отношения, ни Бог к нам*" [3, с. 6]. Адказ збянтэжыў старога, які не ўяўляў жыцця без веры.

Паводле рамана, парадак на месцах на Гродзеншчыне адразу пасля вызвалення наладжвала рабочая гвардыя, у вёсках арганізоўваліся вясковыя камітэты, у мястэчках – валасныя, куды на працу прызначалі больш-менш адукаваных мясцовых людзей. Міця Корсак стаў сакратаром вясковага камітэта, настаўнік Лаўрын Царык – старшынёй Дварчанскага валаснога камітэта. Настойліва хадзілі чуткі пра падзел асадніцкай зямлі, у мястэчку ішла інвентарызацыя асадніцкіх дамоў і падрыхтоўка да народнага сходу. Галоўную задачу мясцовых улад да актывістаў агучыў начальнік зямельнага аддзела валаснога камітэта: "*...проводить политико-массовую работу, чтобы возглавить успешный ход заготовок зерна*" [3, с. 67]. Потым вясковыя камітэты скасавалі і прызначылі ўпаўнаважаных, асадніцкія будынкі вырашылі аддаць пад школы і клубы. Такое рашэнне беднай часткі насельніцтва не вельмі спадабалася. Калі Міця сказаў пра яго землякам, то пачуў ад аднаго з сялян: "*Не маючы дзе жыць, танцаваць пойдзем*" [3, с. 84]. Іншымі словамі, сяляне найперш хацелі перамен матэрыяльных, побытавых, а не культурных.

"*Мяняўся, перайначваўся і раз'юшаным мурашнікам кіпеў разварушаны свет*" [3, с. 157] пасля прыходу Чырвонай арміі, жыццё ўладкоўвалася на іншы лад, сцвярджалася новая сістэма грамадскіх каштоўнасцей, заснаваная на ідэях калектывізму і атэізму. Стары верасавец Літавар абураўся: "*Кожны смаркач начальнікам ці панам быць хоча. Лянуецца, ліха яму, рабіць*" [3, с. 159]. На вызваленай зямлі ствараліся калгасы, за іх развіццё адказвалі прадстаўнікі ўлады, таму новы старшыня часовага ўпраўлення райвыканкама пагражаў аддаць старшыню Дварчанскага валвыканкама пад суд за тое, што адна ўдава забрала з калгаса свайго каня і плуг.

Пры асвятленні заходнебеларускай рэчаіснасці В. Адамчык узняў і праблемы сацыяльнай помсты, зайздрасці, нецярпімасці да іншай думкі. Прадстаўнікі старой улады (солтысы, начальнік Дварчанскай станцыі ды іншыя) былі арыштаваны і высланы. Сумная і распаўсюджаная з'ява таго перыяду – даносы. Як здрадніка арыштавалі Саўку Аўсяніка па даносе яго таварышаў, з якімі ён сядзеў у польскай турме і разышоўся ў поглядах; звольнілі з пасады старшыні валвыканкама Царыка як нібыта агента дэфензівы па даносе яго намесніка; на Міцю ад зайздрасці напісалі лжывы данос, што ён быў стражнікам у польскай турме, "*знаецца*" са сваячкай асадніка і з'яўляецца сынам "*багатыра*". На шчасце, чалавек з органаў, які займаўся справай Міці, здолеў правільна ва ўсім разабрацца.

Звяртаецца ўвага ў творы на ўспрыманне заходнебеларускіх рэалій людзьмі, якія прыязджалі працаваць з усходняй часткі Беларусі. Медыкі-практыканты прызналіся Міцю Корсаку, што думалі ўбачыць куток, дзе панавала суцэльная беднасць, адсутнічалі электрычнасць і радыё, а насамрэч убачылі прыстойныя бытавыя ўмовы. Міця адказаў ім, што бытавыя даброты – не галоўнае ў жыцці, у заходніх беларусаў пры польскай уладзе было мала магчымасцей вучыцца. Адзін з медыкаў параіў Міцю выбраць практычную прафесію, паступаць у медыцынскі інстытут і папярэдзіў, што жыццё людзей складваецца па-рознаму, бо ў грамадстве, якім бы яно ні было, людзі розныя, аднак хлопец зазначыў: "*Я веру ў лепшае. Мы столькі чакалі вас...*" [3, с. 186]. Міця, як і многія яго суайчыннікі, спадзяваўся на перамены да лепшага.

У фінале рамана “**Валошкі на мяжы**” (2004) ***Уладзіміра Гніламедава*** таксама расказваецца пра вызваленне Чырвонай арміяй Заходняй Беларусі і пра звязаныя з ім перамены ў вёсцы Пруска і ўвогуле на Брэстчыне. Падкрэсліваецца, што з самага пачатку нападу Германіі стала відавочнай непадрыхтаванасць Польшчы да вайны, хоць польская кавалерыя з шаблямі кідалася на танкі. Палякі адступалі на ўсход, таму прускаўцы баяліся прыходу немцаў, але замест іх з’явіліся на танках байцы Чырвонай арміі. Людзей здзівілі словы маладога вайскоўца “*таварышы*” і папрок, чаму танкістаў сустракаюць без “*знамёнаў*”. На мітынгу малады вайсковец заявіў: “*У вас, к сажаленію, паны ўсім запраўлялі, цяпер самі будзеце запраўляць! Самі сабе хазяева!*” [4, с. 473]. Насцярожыла прускаўцаў яго прапанова накласці кантрыбуцыю на царкву, бо ад яе “*адзін опіюм*” [4, с. 474], і сцвярджэнне, што прыйшла пара “*жыць па справядлівасці*”: “*Хто каму вінаваты, з ім расчытайцеся! Я думаю, за тое нічога не будзе...*” [4, с. 474]. Вайсковец адразу ж выказаў адносіны і да заходнебеларускіх камуністаў: “*Вашы камуністы – няправільныя камуністы. Падкупіла іх буржуазія*” [4, с. 474]. Праз некаторы час на сходзе ў Прусцы новы выступоўца пераконваў сялян у неабходнасці арганізоўваць калгасы дзеля паляпшэння дабрабыту і падахвочваў спасылкай на поспехі сваіх землякоў: “*У нас пасля калекцівізацыі толькі і жыццё сапраўднае пачалося! І ў вас пачнецца! Там, таварышы, поўны і беспаваротны расцвет*” [4, с. 486]. Савецкая ўлада дазволіла сялянам бясплатна карыстацца лесам, многія пабудавалі новыя хаты. Сяляне марылі падзяліць панскую жывёлу і зямлю, але мясцовае кіраўніцтва не пагадзілася: “*Надзяляць зямлёй – значыць пладзіць новых кулакоў, аслабляць беднату. Гэта класавая слепата і няграматнасць*” [4, с. 495]. Калгас у Прусцы быў арганізаваны, у вяскоўцаў іншага выбару не было, бо яны хацелі жыць на роднай зямлі.

Асвятляецца ў рамане і дзейнасць прускаўскага “*актыву*”, які складаўся пераважна з маладых людзей, сабраных упаўнаважаным ад партыйнага актыву Залатоўскім, што прыехаў на працу з Камянца. У вобразе Залатоўскага паказаны кіраўнік, які не хоча ведаць рэальны стан рэчаў, а кіруецца догмамі. Ён паводзіў сябе самаўпэўнена, абураўся, што не ўбачыў у вёсцы праяў класавай барацьбы: “*...Што гэта ў вас за рэвалюцыя, таварышы, еслі вы, груба кажучы, ніводнага памешчыка не прыкакошылі! Мы ўсё ж такі сазнацельныя бальшавікі, так сказаць. Нада што-та дзелаць*” [4, с. 490]. Ён не давяраў заходнебеларускім камуністам. Дарэчы, іх лёсы, адносіны да іх ва ўз’яднанай Беларусі – адна з істотных праблематычных ліній рамана. Бадай, упершыню расказваецца пра трагедыю людзей, якія змагаліся за вызваленне роднага краю, а потым павінны былі даказваць сваю невінаватасць. Адзін з “*капэзэбоўцаў*” заўважыў сябру: “*Нашы не высоўваюцца. Баяцца. Многіх забралі. А некаторыя і на новую службу пайшлі, следчымі нават працуюць*” [4, с. 527]. Сам ён спадзяваўся, што сітуацыя зменіцца, аднак яго сябар Косця Хлябіч сумняваўся. Самога Косцю неўзабаве беспадстаўна абвінавацілі ў шпіёнскай дзейнасці на карысць Польшчы, і ён апынуўся ў адной турме з жандарамі, якія катавалі “*капэзэбоўцаў*” пры старой уладзе як ворагаў Польшчы.

У “Валошках на мяжы” згадваюцца характэрныя рысы сацыяльных рэалій Заходняй Беларусі, што ўзніклі пасля ўз’яднання: дзейнасць рэўкамаў, прызначэнне на адказныя пасады найперш бедных людзей (участковым міліцыянерам у Прусцы стаў чалавек, у якога былі дзве дзесяціны зямлі і ніякай гаспадаркі), саветызацыя за кошт спецыялістаў, прысланых з усходу. Некаторыя людзі з усходняй часткі Беларусі самі пераязджалі ў яе заходнюю частку дзеля атрымання пасады і звярталі ўвагу на гаспадарлівасць і працавітасць заходніх беларусаў. У рамане згадваецца амаль анекдатычны выпадак, калі ў Брэст завітаў дзівак з шасцю класамі адукацыі і спадзяваннем, што яго паставяць сакратаром райкама толькі таму, што ён “*васточнік*”.

На прыкладзе невялікай заходнебеларускай вёскі Пруска прасочваецца, як заходняя частка Беларусі ўключалася ў жыццё Савецкага Саюза: арганізаваўся калгас, навучанне ў школе было аддзелена ад царквы, выхоўвалася калектывісцкая псіхалогія.

Раманы “Падвышанае неба” Віктара Каваленкі, “Год нулявы”, “І скажа той, хто народзіцца” Вячаслава Адамчыка, “Валошкі на мяжы” Уладзіміра Гніламедава – мастацкае даследаванне чалавечых характараў і лёсаў у дынамічных і драматычных абставінах часу, адмысловыя гістарыяграфічныя крыніцы, угрунтаваныя на адлюстраванні ўз’яднання Заходняй Беларусі з Усходняй як складанага гістарычнага працэсу сацыяльных змен, трансфармацыі сістэмы грамадскіх і асобасных каштоўнасцей на заходнебеларускай тэрыторыі.

**Спіс літаратуры**

1. **Панчанка, П.** Збор твораў : у 4 т. / П. Панчанка. – Мінск : Маст. літ., 1981. – Т. 1 : вершы і паэмы (1934–1945). – 366 с.

2. **Каваленка, В. А.** Падвышанае неба : раман / В. А. Каваленка. – Мінск : Маст. літ., 1978. – 336 с.

3. **Адамчык, В.** Год нулявы : раман / В. Адамчык. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 396 с.

4. **Гніламёдаў, У. В.** Валошкі на мяжы : раман / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 2014. – 574 с.